


## У НУМАРЫ


| ***Навіны*** | ***Навуковая праца*** |
|---|---|
| Масленічная праграма-2023 | Заслаўе ў беларускай культуры |
| Сустрэча з аўтарам | Элементы поясного набора из Заславля |


### ***Навіны***

### Масленічная праграма-2023

Вось і прыйшла да нас Масленічная пара – пара святочная ды вясёлая, поўная гульняў, танцаў, спеваў і, канечне ж, бліноў. Для музея-запаведніка яна традыцыйна насычана клопатамі і вялікай колькасцю гасцей, галоўным чынам – дзяцей. Нагодай для гэтага з'яўляецца правядзенне Масленічнай тэатралізаванай праграмы на этнаграфічным комплексе "Млын". Як заўсёды, непасрэдны ўдзел у свяце прымаюць нашы супрацоўнікі, якія дакладна ўсведамляюць, што дзеці лепш за ўсё ўспрымаюць інфармацыю менавіта праз гульню.

Масленічную праграму для дзяцей наш музей-запаведнік праводзіць ужо шмат гадоў, захоўваючы асноўны сэнс традыцыі і дадаючы некаторыя элементы сучаснасці, якія дапамагаюць хутчэй усталёўваць неабходную камунікацыю з аўдыторыяй, заахвочваць да актыўнасці. Вядома, што і сучасныя дзеці, якія не ўяўляюць сабе свет без мабільных тэлефонаў, камп'ютараў і інтэрнэту, не развучыліся весяліцца, маюць імпэт да скокаў, жартаў, забавак і спаборніцтваў, варта толькі іх да гэтай справы слушным спосабам арганізаваць – і тады ўсё атрымаецца.

Заахвочвальнікамі выступаюць нашы супрацоўнікі, якія на час праграмы ператвараюцца ў сапраўдную вясёлую грамаду, што сустракае хуткі надыход вясны, сустракае Масленіцу. У грамаду, насычаную добрай

энергіяй, якая, нібы па нябачных правадах, перадаецца і дзецям, што таксама робяцца часткай гэтай суполкі. Сярод усяго, напрыклад, нашы малыя госці “гоняць зіму”, спяваюць “Масленку”, ядуць бліны з чаем, бачаць, як на двары па-сапраўднаму гарыць пудзіла зімы – саламяная лялька, якая запальваецца пры канцы праграмы, згодна з традыцыяй.

Традыцыйная масленічная праграма Заслаўскага музея-запаведніка атрымала адлюстраванне ў відэасюжэце (рэпартажы) тэлеканала “Беларусь-1”. Дадзены рэпартаж выйшаў у тэлеэфір 24-га лютага. Ён увайшоў у нізку матэрыялаў, прысвечаных правядзенню Масленічнага тыдня ў Беларусі. Пабачыць згаданы відэасюжэт на ўласныя вочы можна на афіцыйным сайце Белтэлерадыёкампаніі (спасылка падаецца ніжэй *).



*Гарадская Масленіца на этнаграфічным комплексе, госці, 26 лютага 2023 г.*

Абавязкова трэба дадаць згадку і пра тое, што нашы супрацоўнікі не толькі праводзяць уласныя тэатралізаваныя Масленічныя праграмы, але і штогод удзельнічаюць у гарадской Масленіцы, дапамагаюць у правядзенні гульняў і конкурсаў. Шэраг гадоў гарадская Масленіца адбывалася пры гарадскім Доме культуры “Світанак”, гэтым жа годам яе арганізавалі на тэрыторыі этнаграфічнага комплекса “Млын”. Значную дапамогу тут аказалі нашы супрацоўнікі, якія не толькі ўдзельнічалі ў стварэнні святочнай атмасферы, але і гасцінна сустракалі людзей на аб'ектах комплекса, распавядаючы ім аб жыцці і побыце продкаў.



*Гарадская Масленіца на этнаграфічным комплексе, выступоўцы, 26 лютага 2023 г.*

* спасылка на відэасюжэт (https://www.tvr.by/news/obshchestvo/sovremennuyu_maslenitsu_s_perepleteniem_narodnykh_traditsiy_predlagayut_v_muzee_zapovednike_zaslavl/).

**Сустрэча з аўтарам**

24 лютага ў музейна-выставачным комплексе музея-запаведніка адбылася сустрэча з **Мікалаем Мішчанкам** – аўтарам карцін, выстаўленых у нашай зале часовых выставак. Нядаўна шаноўнаму творцу споўніліся 74-ы гады і гэта сустрэча стала пэўнай нагодай дапоўніць свята, бо лепшы падарунак для мастака – гэта ўвага з боку людзей, зацікаўленых яго творчасцю.

Удзел у сустрэчы прынялі мастакі **Віктар Данілаў і Леанід Гоманаў**, супрацоўнікі музея-запаведніка. Гасцямі і, адначасова, галоўнай мэтавай аўдыторыяй мерапрыемства былі настаўніцы малявання Заслаўскай дзіцячай школы мастацтваў (ДШМ) і іх выхаванцы.

Мікалай Мішчанка шмат распавёў аб сваёй вандроўцы, што адбылася па запрашэнні ад кітайскіх сяброў, у складзе групы з дзесяці мастакоў у кітайскі горад Чунцын, які фактычна з'яўляецца цэлай правінцыяй, па плошчы сваёй – амаль роўнай усёй плошчы Беларусі. Іх група пражыла ў Чунцыне амаль 20-ць дзён, стварыла пад час пленэрнай работы 110-ць прац. Дзве свае карціны (алейныя работы), з ліку створаных у Кітаі з натуры, Мікалай Мішчанка падараваў Мастацкаму музею Чунцына (Chongqing Art Museum) – яны былі ўрачыста прыняты ў фонды музея на пастаяннае захоўванне. Мікалая ўсцешыла вялікая ўвага да групы нашых мастакоў з боку арганізатараў іх вандроўкі: мастакоў суправаджаў перакладчык, валанцёры, іх саміх і ўсе патрэбныя рэчы перавозілі на машынах. Пад час пленэрнай працы на вуліцах Чунцына да нашых мастакоў нярэдка падыходзілі зацікаўленыя мінакі, якія прасілі дазволу ў творцаў зрабіць фота разам з імі і, атрымаўшы такі дазвол, рабілі яго з добрымі ўсмешкамі і вялікай ахвотай.



*Сустрэча з мастаком Мікалаем Мішчанкам (стаіць злева),*
*справа – госці мерапрыемства*

Аўтар таксама адзначаў, што яму было вельмі цікава пабываць у Чунцыне, пабачыць асаблівасці культуры яго жыхароў, а таксама – іх

будзённае жыццё. У памяці засталіся рынкі Чунцына і незвычайныя тавары, якія прапаноўвалі ў розных крамках. Значна ўразілі яго гандлёвыя цэнтры, а найбольш – тунэлі, прабітыя праз горы, працягласцю роўныя некалькім кіламетрам, а таксама руплівасць кітайцаў. Каменную пароду, якая была выдалена з гор пры будаўніцтве тунэляў, удала выкарысталі для патрэб грамадзянскага будаўніцтва.

Пытанні Мікалаю Мішчанку задавалі як дзеці – выхаванцы Заслаўскай ДШМ, так і іх настаўнікі. Шмат у чым яны былі абумоўлены зместам выстаўкі, якая складалася з акварэльных работ у жанры пейзаж, – гутарка вялася як аб акварэлі ў якасці матэрыяла непасрэдна, так і аб асаблівасцях працы ў Кітаі, тэхніцы, якую выкарыстоўваюць уласна сучасныя кітайскія мастакі пры стварэнні сваіх карцін.

Слова ўзялі і мастакі – сябры Мікалая Мішчанкі: Віктар Данілаў і Леанід Гоманаў. Віктар Данілаў уручыў Мікалаю памятны падарунак. Таксама памятны падарунак для творцы (шыкоўна аформлены насценны каляндар буйнога фармату) ўручылі і настаўнікі Заслаўскай ДШМ, выказаўшы разам з тым вялікую падзяку за магчымасць сустрэцца з мастаком, за сустрэчу, якая пайшла на карысць іх вучням.



*Мікалай Мішчанка пры сваіх работах, напісаных з натуры у г. Чунцын*

Мікалай Мішчанка быў узрадаваны сустрэчай з Заслаўем і, асабліва, – з яго маленькімі жыхарамі. Ён прыгадаў, што мінулы раз быў тут 40 гадоў

таму, што горад з таго часу вельмі змяніўся. Мікалай адзначыў, што святло і прастора нашай залі часовых выставак удала пасуе да яго работ і яму гэта вельмі падабаецца. Магчыма, нас будуць чакаць і іншыя сустрэчы з творцай, карціны якога захоўваюцца ў Беларусі, Сербіі, Партугаліі, Кітаі... У сваю чаргу, наш музей-запаведнік выказвае шчырую падзяку Мікалаю Мішчанку за работы, прадстаўленыя на выстаўку і за выдатную творчую сустрэчу, зычыць яму натхнення, новых адкрыццяў і поспехаў.

***Навуковая праца***

**Заслаўе ў беларускай культуры**

*Дзень беларускага пісьменства і друку-2014 як з'ява ў беларускай культуры*

У 2014 г. горад Заслаўе прымаў вялікае свята рэспубліканскага ўзроўню – XXI-ы Дзень беларускага пісьменства і друку. Горад ужо меў вопыт правядзення такога кшталту ўрачыстасці ў 2000 г., калі прымаў VII-ы Дзень беларускага пісьменства і друку. У гэтай справе на 2023 г. Заслаўе "перагнаў" толькі Полацк, які прымаў гэта свята тройчы, а Тураў "зраўняўся" па колькасці разоў. У гэтым факце яскрава выяўляецца высокі статус Заслаўя ў рэчышчы беларускай гісторыі і культуры.



*Дзень беларускага пісьменства ў Заслаўі-2014*
*(фота з афіцыйнага сайта Рэспублікі Беларусь – Belarus.by)*

У медыяпрасторы маецца найбольш матэрыялаў аб святкаванні Дня беларускага пісьменства і друку ў Заслаўі ў 2014 г. Па 2000 г. іх нашмат менш. Гэта абумоўлена натуральнымі чыннікамі, сярод якіх трэба ўлічыць і ўзровень развіцця медыятэхналогій, што на 2014-ы год быў нашмат вышэйшы за 2000 год і некаторыя іншыя. Па 2014-м годзе мы маем відэарэпартажы беларускіх тэлеканалаў, загружаныя на відэахостынг YouTube, артыкулы ў газетах, якія можна прачытаць на афіцыйных сайтах выданняў, матэрыялы на старонках разнастайных інтэрнэт-парталаў, пасты ў сацыяльных сетках і іншы кантэнт. Звернемся да пэўнай яго часткі, каб зрабіць некаторыя высновы.

Відэарэпартажы, у якіх адбіліся падзеі падрыхтоўкі і правядзення XXI-га Дня беларускага пісьменства і друку, падрыхтавалі тэлеканалы “АНТ”, “СТВ”, “МКТВ” (Маладзечанскае тэлебачанне). Яны і зараз ёсць у свабодным доступе на відэахостынгу YouTube, а таксама на афіцыйным сайце тэлеканала “СТВ” (у межах выпуска навін “24 часа” за 06.09.2014 г.). Знайсці іх можна з выкарыстаннем такіх запытаў: “День белорусской письменности и печати 2014”, “День белорусской письменности и печати в Заславле”. Журналісты і іх здымачныя групы прыклалі вялікія намаганні, каб перадаць навіны з Заслаўя гледачам, адлюстраваць асноўныя моманты свята, якое доўжылася два дні (суботу і нядзелю), выклікаць інтарэс у аўдыторыі, а таксама жаданне прыняць у ім удзел, прыехаць у Заслаўе. У ліку журналістаў, якія непасрэдна вялі рэпартажы, былі Ганна Ваўкавец, Аляксей Болатаў, Аляксандр Мацяс, Вольга Макей і іншыя.

У рэпартажах адлюстраваліся самыя розныя моманты і факты. Так, напрыклад, згадваецца, што на момант свята ў Заслаўі пражывала больш за 14000 чалавек; да Дня беларускага пісьменства і друку ў Заслаўі былі праведзены рамонтныя работы па будынку Спаса-Праабражэнскай царквы, праведзена рэканструкцыя пляца для мерапрыемстваў на Рынкавай плошчы, абнаўленне школ і іншых грамадскіх будынкаў, вуліц, дваравых тэрыторый і дарог, адкрыты новыя аб’екты – дзіцячы парк культуры і адпачынку, помнік заснавальніку горада – князю Ізаславу, створаны малыя архітэктурныя формы з камянёў (у іх ліку – выява пячаткі князя Ізяслава) і дрэва (казачныя персанажы). І гэта толькі асноўная замалёўка зробленага, а зроблена, насамрэч, было больш. Асобна трэба адзначыць рэпартаж Аляксандра Мацяса, у якім змешчана інтэрв’ю са скульптарам Аляксандрам Прохаравым, які стварыў помнік князю Ізяславу (так, напрыклад, даведваемся аб вышыні помніка з улікам пастамента – 5,05 м), ёсць згадка аб сродках, выдаткаваных для свята з раённага, абласнога і рэспубліканскага бюджэта – 200 мільярдаў рублёў. Журналісты далі

высокую ацэнку арганізацыі свята, працы горада майстроў, гандлю, натхніліся магчымасцю папрацаваць за кніжным варштатам, зробленым па ўзоры варштата XVI ст., магчымасцю пабачыць, як раней майстры атрымлівалі паперу для кніг, натхніліся сустрэчамі з паэтамі, пісьменнікамі, прадстаўнікамі розных выдавецтваў, а таксама – святочным канцэртам. Сцэна для святкавання была арганізавана ў межах гарадзішча “Вал”. Для гледачоў пры сцэне спецыяльна падрыхтавалі 2500 месцаў, але агулам гасцей там пабывала нашмат больш, бо для агляду выкарыстоўвалі ўсю вольную прастору, ды і кола гледачоў не было статычным: людзі перамяшчаліся паміж горадам майстроў і арганізаванымі кропкамі грамадскага харчавання, якія размяшчаліся ў межах вул. Савецкай і Рынкавай, музейнымі аб’ектамі горада і гарадзішчам “Вал”.




*Канверт з арыгінальнай маркай “Дзень беларускага пісьменства”,*
*РУП “Белпошта”, 2014 г.*

Многія людзі на гэтым свяце адкрылі для сябе Заслаўе ўпершыню, многія – пазналі новыя грані яго незвычайнай атмасферы, утульнасці, багатай гістарычнай і культурнай спадчыны, захавання пераемнасці вякоў. У ліку гасцей, якія адкрылі для сябе Заслаўе быў таксама і міністр культуры і мастацтваў Шры-Ланкі Віджэсундара Мудзіянселанге Цілакаратне Бандара Эканаяке.

XXI-ы Дзень беларускага пісьменства і друку ў Заслаўі адбыўся як вялікае і запамінальнае свята, на якім было чаму падзівіцца і старому, і

малому, і аматарам кнігавыдавецкай справы, і дасведчаным у гэтай галіне асобам. Утульна на гэтым святе было сем’ям: разам з бацькамі, дзядулямі і бабулямі па старажытным горадзе гуляла вельмі шмат дзяцей, для развагі якіх таксама быў урачыста адкрыты парк з гульнявымі пляцоўкамі. Дзеці – пераймальнікі традыцый і здабыткаў продкаў, новае пакаленне іх захавальнікаў, будучыня дзяржавы, таму вельмі важна надаваць усебаковую ўвагу іх развіццю. Выдатна, што і Заслаўе шмат гэтаму спрыяла і працягвае спрыяць як адно з апірышчаў беларускай гісторыі і культуры.

***Выкарыстаныя матэрыялы***

1. В Заславле лучшим литераторам страны вручили "Золотых Купидонов" [электронный ресурс] – официальный сайт "МН" – Агентства "Минск-Новости". – Режим доступа: https://minsknews.by/v-zaslavle-luchshim-literatoram-stranyi-vruchili-zolotyih-kupidonov/. – Дата доступа: 14.02.2023.
2. В Заславле проходит День белорусской письменности [электронный ресурс] – официальный сайт газеты "Комсомольская правда". – Режим доступа: https://www.kp.ru/daily/26279.5/3156476/. – Дата доступа: 14.02.2023.
3. В Заславле проходит XXI День белорусской письменности [электронный ресурс] – официальный сайт газеты "Зорька". – Режим доступа: http://www.zorika.by/?p=19763. – Дата доступа: 14.02.2023.
4. В Заславле прошел День белорусской письменности [электронный ресурс] – официальный сайт Заславского городского исполнительного комитета. – Режим доступа: https://zaslavl.minskregion.by/novosti/v-zaslavle-proshel-den-belorusskoy-pismennosti/. – Дата доступа: 14.02.2023.
5. В Заславле прошел День письменности-2014 [электронный ресурс] – официальный сайт издательства "Четыре четверти". – Режим доступа: https://www.4-4.by/ob-izdatelstve. – Дата доступа: 14.02.2023.
6. В Заславле отметили День белорусской письменности [электронный ресурс] – официальный сайт Постоянного Комитета Союзного государства. – Режим доступа: https://xn--c1anggbdpdf.xn--p1ai/culture/200540/. – Дата доступа: 14.02.2023.
7. ДЕНЬ БЕЛОРУССКОЙ ПИСЬМЕННОСТИ [электронный ресурс] – официальный сайт газеты "Край смалявіцкі" – районная газета Смолевичского района. – Режим доступа: http://kraism.by/archive/7012-den-belorusskoy-pismennosti.html. – Дата доступа: 21.02.2023.
8. День белорусской письменности в Заславле [электронный ресурс] – официальный сайт УО "Борисовский государственный строительный колледж". – Режим доступа: http://bgspl.by/2014/09/den-belorusskoj-pismennosti-v-zaslavle/. – Дата доступа: 21.02.2023.
9. День белорусской письменности-2014 в Заславле: историческая реконструкция [электронный ресурс] – официальный сайт Республики Беларусь. – Режим доступа: https://www.belarus.by/rel_image/6004. – Дата доступа: 21.02.2023.
10. День белорусской письменности проходит в Заславле [электронный ресурс] – Официальная страница телеканала "СТВ". – Режим доступа: https://ctv.by/novosti-minska-i-minskoy-oblasti/den-belorusskoy-pismennosti-prohodit-v-zaslavle. – Дата доступа: 21.02.2023.

11. День белорусской письменности или как мы попали на праздник всея Беларуси [электронный ресурс] – Портал Shagau.ru (шагаем по миру) – Портал о путешествиях. – Режим доступа: https://shagau.ru/2014/09/10/den-belorusskoj-pismennosti-ili-kak-my-popali-na-prazdnik-vseya-belarusi. – Дата доступа: 14.02.2023.
12. "День белорусской письменности-2014" пройдет 7 сентября в Заславле [электронный ресурс] – Туристический портал VP.BY: отзывы и впечатления об отдыхе, статьи о городах, странах и курортах, путешествия по Беларуси и по всему миру, новости туризма. – Режим доступа: https://blog.vp.by/2014/08/den-pismennosti-zaslavl-2014.html. – Дата доступа: 14.02.2023.
13. День белорусской письменности отметили в Заславле [электронный ресурс] – официальный сайт газеты “Беларусь Сегодня”. – Режим доступа: https://www.sb.by/articles/kniga-istochnik-zvaniya-09092014.html. – Дата доступа: 21.02.2023.
14. XXI День белорусской письменности прошел 7 сентября 2014 года в городе Заславль [электронный ресурс] – официальный сайт ГУО “Средняя школа г.п. Мир им. А.И. Сташевской”. – Режим доступа: https://mir.schools.by/news/32919. – Дата доступа: 21.02.2023.
15. Заславль отметил День белорусской письменности [электронный ресурс] – Новостной портал “RGRU”. – Режим доступа: https://rg.ru/2014/09/11/pismennost.html. – Дата доступа: 14.02.2023.
16. Какую память оставил День белорусской письменности в столицах праздника? [электронный ресурс] – официальный сайт газеты “Звязда”. – Режим доступа: https://zviazda.by/be/node/141397. – Дата доступа: 21.02.2023.
17. Мероприятия, приуроченные к XXI Дню белорусской письменности, прошли 6-7 сентября в г. Заславле [электронный ресурс] – официальный сайт СИРП – Союза издателей и распространителей печати. – Режим доступа: http://sirp.by/2014/09/08/meropriyatiya-priurochennye-k-xxi-dnyu-belorusskoj-pismennosti-proshli-6-7-sentyabrya-v-g-zaslavle/. – Дата доступа: 14.02.2023.

* таксама быў выкарыстаны шэраг відэаролікаў з відэахостынга YouTube (запыт на пошук: “День белорусской письменности и печати 2014”).

## **Да матэрыялаў канферэнцыі**

*Быў час, калі наш музей-запаведнік выступаў у якасці арганізатара і мадэратара канферэнцый. Яны адбываліся на працягу шэрагу гадоў. Ад іх працы захаваліся даволі цікавыя матэрыялы, якія друкаваліся ў спецыяльных зборніках. У гэтым нумары мы хочам Вам прапанаваць адзін з такіх матэрыялаў, які быў надрукаваны ў зборніку “Старажытныя гарады: праблемы даследавання, музеефікацыі, захавання помнікаў і гістарычных тэрыторый” у 2011 г., па выніках канферэнцыі, арганізаванай нашым музеем-запаведнікам. Звернемся да здабыткаў археалогіі, да Заслаўскіх старажытнасцяў, на аснове артыкула*

*аспіранта Інстытута гісторыі НАН Беларусі **П.М. Кенько**, які падаем без змяненняў. Магчыма, калісьці традыцыя правядзення канферэнцый Заслаўскім музеем-запаведнікам адновіцца зноў.*

## Элементы поясного набора из Заславля

Ременной набор является очень интересным археологическим источником, несущим в себе разнообразные виды информации. На основании их исследования можно выделить две основные функции пояса:

**1. Утилитарная.** Пояс во все времена служил для стягивания одежды, но к нему, кроме того, часто подвешивались кошельки, сумки, ножи и также меч или сабля.

**2. Социальная.** Костюм всегда служил отражением социального положения его владельца, а пояса у восточных славян были наиболее ярким показателем статуса человека. В.В. Мурашева выделила три типа поясов, характерных для Древней Руси [Мурашева, 2000, с. 70].

Тип I — “бытовой” (утилитарный) — украшен лишь пряжкой (или пряжкой и кольцами, соединяющими отдельные части ремня). Как находка присущ, как правило, сельским кладбищам.

Тип II — состоит из пряжки и поясного наконечника. Определить его социальное предназначение затруднительно, так как его находки на территории Беларуси редки.

Тип III — наборный пояс — его характерной особенностью является наличие бляшек; пряжка, наконечник и другие детали могут присутствовать или нет. Именно этот пояс являлся принадлежностью дружинника, свидетельствовал о его заслугах и показывал ранг его обладателя в социальной структуре; это отражалось в количестве бляшек, украшавших пояс. Два таких пояса было найдено в курганах Заславля, именно о них и пойдет речь.

Первый пояс найден А.Н. Левданским [Ляўданскі, 1928, ст. 89-90, табл. XVIII] в погребении 3 удлиненного кургана № 18 группы II (у Ю.А. Зайца этот же курган обозначен под № 16 (43) группы II). Он состоял из двух наконечников (рис. 1: 1-2) и 49 накладок двух типов (28 тип I (рис. 1: 3), 21 тип II (рис. 1: 4). В качестве пряжки использовались подковообразная спиралеконечная фибула (рис. 1: 5). Среди инвентаря — бронзовый браслет с разомкнутыми утончающимися концами, серп, фрагмент дирхема Нуха ибн Нарса (942 — 954 гг.), бронзовая пуговица, нож и горшок с тамгообразным клеймом.

Второй пояс найден Ю.А. Зайцем [Заяц, 1996, с. 132, рис. 2Б, 16] в кургане № 5 (3) группы I. Он состоял из пряжки, четырех наконечников, на

одном из которых процарапан трезубец, и накладок четырех разновидностей, общее число которых не установлено (рис. 1: 6-12). В погребальный инвентарь входили также бронзовый браслет с разомкнутыми утончающимися концами и втульчатый наконечник стрелы с плоским пером.




Рис. 1: Элементы поясных наборов из Заславля. 1-5 из кургана № 16 группы II; 6-12 из кургана № 5 группы I; 13 - городище «Замэчек».

*Арыгінальныя выявы да артыкула “Элементы поясного набора из Заславля”*

На городище “Замэчек” была найдена накладка от наборного пояса сердцевидной формы (рис. 1: 13) [Заяц, 1995, с. 69, рис. 51: в].

Аналоги заславским накладкам были найдены как на территории Беларуси, так и за ее пределами.

I тип поясных наконечников (рис. 1: 1, 7-8) — общий для обоих поясов (форма — трапециевидные с расширением в верхней части, верхний край прямой, нижний оформлен в виде пятилистника). Идентичные заславским накладки были найдены возле д. Замошье Толочинского района Витебской области [Сергеева, 1972, с. 5, рис. 5]; в курганном могильнике Гнездово, Смоленская область, вторая половина X в. [Мурашева, 2000, с. 126, рис. 103, О6] и в Люцинском могильнике, Латвия [Ciglis Radiņš, 2002, p. 187, 190. 66 att.: 12. 69 att.: 4].

II тип поясного наконечника из кургана № 16(43) группы II. Орнамент — два рифленых овала. Аналоги пока не найдены.

Накладок в Заславле найдено 7 типов. I и II тип из кургана № 16 (43) группы II. III — VII типы — из кургана № 5 (3) группы I.

I тип — сердцевидные с каплевидным выступом и рифленым ободком, орнамент — полумесяц (рис. 1: 3). Идентичные найдены в Люцинском могильнике, Латвия [Ciglis Radiņš, 2002, p. 190. 69 att.: 4].

II тип — пятиугольные с рифленым ободком, орнамент — полумесяц. Аналоги пока не найдены (1: 4).

III тип — пятиугольные широкие, на лбу совы — трехлепестковый цветок (рис. 1: 9). Идентичные: д. Заямочное Минского района, вторая половина X в. [Кенько, с. 145, рис. 1: 1-4]; Лемешевичи, Пинский район Брестской области [Іоў, Вяргей, ст. 127, рис. 3: 4]; Владимирская область, Давыдково, курган № 127 (?), X — XI вв.; Тверская область, близ г. Старица, вторая половина X в. [Мурашева, 2000, с. 116, рис. 67, 1А-2].

VI тип аналогичен третьему типу, имеются лишь небольшие различия в размерах, и на лбу совы изображен не трехлепестковый цветок, а сердце (рис. 1: 10).

V тип — пятиугольная узкая, немного отличалась от третьего типа орнаментом и расположением трехлепесткового цветка (рис. 1: 11). Идентичные: Заямочное Минского района, вторая половина X в. [Кенько, с. 145, рис. 1: 5]; Владимирская область, Давыдково, курган № 127 (?), X — XI вв. [Мурашева, 2000, с. 116, рис. 67, 1А-1].

VI тип — сердцевидные с рифленым ободком (рис. 1: 12). Аналогичные: Владимирская область, Шошково, курган № 116, X — XI вв.; Ярославская область, Тимерево, курган № 76, конец X — начало XI в. [Мурашева, 2000, с. 109 рис. 35, 1б].

VII тип — найденная на городище “Замэчек” сердцевидная с пальметтами в центре и рифленым ободком (рис. 1: 13). Идентичная в Люц инском могильнике, Латвия [Ciglis Radiņš, 2002, p. 190. 69 att.: 2].

Что касается застежек, то в поясе из кургана № 16 (43) группы II вместо пряжки использовалась подковообразная фибула (рис. 1: 5). Такой способ застегивания наборного пояса встречается редко. Но найденный в кургане у д. Замошье Толочинского района Витебской области наборный пояс также застегивался на фибулу [Сергеева, 1972, с. 5, рис. 5]. Пряжка из погребения в кургане № 5 (3) группы I уникальна, аналогов ей нет ни в Беларуси, ни на территории других государств.

При сопоставлении с аналогичными находками, описанными в литературе, можно датировать эти наборные пояса второй половиной X ве

ка.



Рис. 2: Реконструкция наборного пояса из кургана № 5группы I.



Рис. 3: Реконструкция наборного пояса из кургана № 16 группы II.

*Арыгінальныя выявы да артыкула “Элементы поясного набора из Заславля”*

Первым реконструкцию наборного пояса из Заславля выполнил Ю.А. Заяц [Заяц, 1987, с. 19, 22], который допустил небольшую ошибку при расположении накладок типа III (стилизованная голова совы), повернув их клювами вверх. На самом деле они должны были глядеть клювами вниз. Это подтверждается аналогичными находками из д. Заямочное Минского района [Кенько, с. 145-148, рис. 1-3], где сохранились остатки кожаного ремня с прилепленными к нему бляшками, у которых клювы смотрели вниз. Переделанную реконструкцию наборного пояса из кургана № 5 (3) группы I автор представил на рисунке 2. Реконструкцию из кургана № 16 (43) группы II можно сделать только приблизительно, так как А.Н. Левданский не оставил точной схемы расположения накладок на ремне. В первом томе

Трудов кафедры археологии за 1928 год были опубликованы лишь фотографии небольших участков кожи с бляшками, по ним и была сделана реконструкция (рис. 3).

Таким образом, можно утверждать, что в Заславле в конце X — начале XI вв. выделилось боярское сословие воинов, которые носили богато украшенные ременными накладками пояса, отличавшие их среди прочих жителей. Сами пояса, несомненно, импортные, скорее всего хазарского происхождения.

***Литература:***


1. Іоў А.В., Вяргей В.С. Гандлёва-эканамічныя сувязі насельніцтва Заходняга Палесся ў IX – пач. XI стст. // Гістарычна-археалагічны зборнік: памяці Міхася Ткачова. У 2-х ч. Ч. 1. – Мн., 1993. – С. 117-134. – (Інстытут гісторыі АН Беларусі).
2. Заяц Ю.А. Заславль в эпоху феодализма. – Мн., 1995. – 207 с.
3. Заяц Ю.А. Заславль X-XVIII веков: Историко-археологический очерк. – Мн., 1987. – 63 с. – (Академия наук БССР, Институт истории).
4. Заяц Ю.А. Социальные группы населения Изяславля на стадии формирования и раннем этапе развития города (X – XI вв.): по материалам заславского курганного могильника // Гістарычна-археалагічны зборнік № 8. – Мн., 1996. – С. 129-147. – (Інстытут гісторыі АН БССР).
5. Кенько П.М. Наборный пояс второй половины X – первой половины XI вв. из деревни Заямочное Минского района // Археалогія эпохі Сярэдневякоўя: Да 75-годдзя з дня нараджэння П.Ф. Лысенкі. - Мн.: 2006. – С. 145-148. – (Інстытут гісторыі НАН Беларусі. Матэрыялы па археалогіі Беларусі № 12).
6. Ляўданскі А.Н. Архэолёгічныя раскопкі ў м. Заслаўі, Мескай акругі // Запіскі аддзелу гуманітарных навук. Кн. 5. Працы катэдры археолёгіі. Т. 1. – Мн., 1928. – С. 1-93. – (Інстытут беларускае культуры).
7. Мурашева В.В. Древнерусские ременные наборные украшения (X – XIII вв.). – М., 2000. – 136 с.
8. Сергеева З.Н. Отчет об археологических работах в Витебской обл. В 1972 г. // Архив Института истории НАН Беларуси. Дело № 414, 414 а.
9. Ciglis J., Radiņš A. Ludzas odukalna kapulauka katalcs, latwijas vēstures musejs, Riga, 2002, 250 p.



**Выданне не з'яўляецца камерцыйным:** распаўсюджваецца дармова (бясплатна) і выключна ў адукацыйных і асветніцкіх мэтах для знаёмства з працай і здабыткамі ДУ «ГКМЗ «Заслаўе».

**Газета «Заслаўскія зборы» існуе толькі ў электронным выглядзе**, з мэтай рэалізацыі шырокага доступу да яе матэрыялаў праз сетку «Інтэрнэт», а таксама – ашчаднага стаўлення да прыродных рэсурсаў.

**Рэдкалегія: Сабалеўская І.В., Арцемьева І.Д., Пакінка А.В., Кандратовіч І.Г.**

**Рэгулярнасць:** газета выдаецца раз на месяц.